## Казімір Сваяк – святар і пісьменнік

**Біруля Кацярына Вячаславаўна,**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле разглядаецца асоба і творчасць святара Канстанціна Стэповіча, вядомага ў беларускай літаратуры пад псеўданімам Казімір Сваяк. Спалучаючы святарскую і літаратурную дзейнасць, ён увайшоў у гісторыю каталіцкай царквы як змагар за беларусізацыю касцёла, а ў гісторыю літаратуры як арыгінальны аўтар.*

Казімір Сваяк – літаратурны псеўданім каталіцкага святара Канстанціна Стэповіча. Спалучыўшы святарскую, літаратурную і грамадска-асветніцкую дзейнасць, ён увайшоў у гісторыю і літаратуру як актыўны дзеяч беларускага нацыянальнага адраджэння, якое разгарнулася ў пачатку XX стагоддзя. Нарадзіўся будучы святар і пісьменнік у 1890 г. у вёсцы Барані Свянцянскага павета Віленскай губерні (зараз Астравецкі раён Гродзенскай вобласці). Дружная і набожная сям'я паўплывала на свядомы выбар маладога чалавека – паступіць у духоўную навучальную ўстанову. У 1908 г. ён становіцца навучэнцам Віленскай духоўнай семінарыі, якую паспяхова заканчвае ў 1914 г. Так пачынаецца яго шлях з народам да Бога.

На жаль, К. Стэповіч пражыў кароткае жыццё (святар-пісьменнік памірае ў 1926 г. ад сухотаў), але за гэты непрацяглы час ён паспеў шмат зрабіць. Будучы ўжо святаром, К. Стэповіч выступае за ўвядзенне ў касцёлах набажэнстваў на беларускай мове. Патрыятычна натхнёныя беларускія святары К. Стэповіч, А. Станкевіч, Я. Германовіч і інш. адыгралі вялікую ролю ў справе несці Божае слова на зразумелай народу мове. Разгарнуўся рух за беларусізацыю касцёла. Напрыканцы навучання ў семінарыі ў К. Стэповіча ўзмацняецца патрыятычны настрой, пра што сведчаць яго дзённікавыя запісы "Дзея маёй мыслі, сэрца і волі": "Ад даўняга часу чую я да цябе, маці Беларусь, асаблівую прывязанасць – і болей чым прывязанасць: надта гэтае адчуццё глыбока зарылася ў сэрцы – пэўна гэта міласць, каханне сэрца. Люблю я цябе і сільна люблю" [1, с. 349]. Святар вырашае раз і назаўжды звязаць сваё жыццё з роднай краінай: "Хачу служыць табе, аддаць сябе для дабра душы тваёй. А яна – душа твая – чакае ахвяраў. Патрэбны ахвяры, калі мае прыйсці выбаўленне. Я не пайду шырокім разгонам людскога рахунку. Я хачу служыць тваім духоўным патрэбам, беларусе. А яны грамадны" [1, с. 350]. Так паэтычна, пранікнёна і шчыра святар вызначае асноўную мэту сваёй дзейнасці – служыць беларускаму народу. Канстанцін Стэповіч параўноўвае такую дзейнасць з евангельскім вобразам жніва: "Жніво вялізнае, а працаўнікоў мала" [1, с. 350]. Менавіта такім працаўніком на роднай беларускай глебе становіцца святар.

Першыя гады святарства К. Стэповіч правёў у парафіі вёскі Камаі Свянцянскага павета. Ён працуе вікарыем, выконвае свае прамыя абавязкі, удзяляе святыя сакраманты. Пасля працы ў Камаях К. Стэповіч вяртаецца ў парафію ў Клюшчаны.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Менавіта тут ён праводзіць актыўную працу сярод моладзі, пачынае ўводзіць беларускую мову ў касцёле і школе. У дзённікавых запісах святара чытаем: “Справа беларушчыны зачынае прымаць зусім правідны характар” [1, с. 356]. Намаганнямі святара былі заснаваныя сем беларускамоўных школ, а таксама адкрыты настаўніцкія курсы. Аднак хутка з’яўляюцца незадаволеныя яго дзейнасцю па беларусізацыі. К. Стэповіча пераводзяць у іншае месца. У 1916–1917 гг. ён служыць у парафіі вёскі Карыцін. Сваю нацыянальна-асветніцкую дзейнасць ён распачынае і на новым месцы. Гэта не спадабалася пробашчу парафіі, які ў хуткім часе забараніў распаўсюджванне беларускіх выданняў і выкарыстанне беларускай мовы ў святыні. К. Стэповіч вымушаны быў спыніць беларускую справу. Адзінота, цяжкая атмасфера навокал выклікалі шчыры боль у святара за народ і краіну: “Баліць мне сэрца за народ, каторага няшчасце не магу апісаць” [1, с. 364]. На першае месца святар ставіў працу па адраджэнні краіны, горача прасіў Бога дапамогі ў нялёгкай справе: “Пазволь мне – памажы мне быць карысным справе духоўнага адраджэння майго брата занядбанага” [1, с. 369]. Такім чынам, дзейнасць К. Стэповіча ў святарскім служэнні народу носіць асветніцкі характар. Разуменне народнай псіхалогіі, веданне народных традыцый, быта, любоў да Бога і чалавека дапамагаюць святару адкрыць у сабе і другое пакліканне – пісьменніцкае.

У беларускай літаратуры святар выступаў пад псеўданімам Казімір Сваяк. Творчасць пісьменніка даследчыкі адносяць да літаратуры Заходняй Беларусі. Творчая спадчына К. Сваяка дастаткова разнастайная. Выдатны паэт, публіцыст, крытык, эсэіст, драматург, мемуарыст спалучаюцца ў яго асобе. Вобразы, матывы, тэматыка творчасці пісьменніка разгортваюць перад намі карціну вясковага жыцця. Маляўнічая прырода, цяжкая сялянская праца, разуменне агульначалавечых каштоўнасцей у сям’і, служэнне беларускаму народу, святарская дзейнасць – фактары, якія надаюць адметнасць спадчыне пісьменніка і робяць яго творчасць арыгінальнай. Нельга забываць, што ў першую чаргу К. Стэповіч – святар, і асноўная мэта яго дзейнасці – прапаведніцкая. І ў дадзеным выпадку літаратура адыграла вялікую ролю. Праз літаратурную творчасць можна было выказваць свае думкі, несці хрысціянскую навуку народу. Тонкі хрысціянскі падтэкст праходзіць праз усе творы пісьменніка. Даследчык І. Трацяк адзначае: “Для культурна-асветніцкай працы беларускіх каталіцкіх святароў характэрны два кірункі: практычна-функцыянальны (душпастырства, беларусізацыя касцёльнага жыцця, удзел у культурна-грамадскіх і палітычных арганізацыях, рэдакцыйная і выдавецкая справа) і гуманітарна-тэарэтычны (філасофска-тэалагічныя, гістарычныя, культуралагічныя і іншыя навукова-публіцыстычныя даследаванні), а таксама мастацкая літаратура як сродак папулярызацыі рэлігійна-нацыянальных ідэй” [1, с. 9]. У рэчышчы гэтых кірункаў якраз і працаваў К. Стэповіч.

У 1924 г. у Вільні выходзіць адзіная прыжыццёвая кніга Казіміра Сваяка “Мая ліра”. Гэта сапраўдная вяршыня яго творчасці. Зборнік арыгінальны па сваёй тэматыцы і жанрава-стылёвай разнастайнасці вершаў. Кніга выклікала пэўны рэзананс ў тагачаснай заходнебеларускай крытыцы. Выступілі з рэцэнзіямі У. Самойла (Суліма), А. Луцкевіч (А. Навіна). Паэзія К. Сваяка разглядалася імі найперш у філасофска-эстэтычным (Суліма) і грамадска-сацыяльным (Навіна) аспектах, што прывяло, на думку А. Станкевіча, да скажэння рэлігійна-духоўнага зместу творчасці паэта [2, с. 20].

Акрамя паэтычнай спадчыны ў творчасці К. Сваяка пачэснае месца займае проза. Найбольш часта ён звяртаўся да жанру апавядання. Апавяданні пісьменніка



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

часта спалучаюць у сабе сацыяльна-бытавыя малюнкі з тонкімі элементамі псіхалагізму, лірызму і філасофскіх разваг над жыццём і яго сэнсам. Вясковы побыт, праблемы, пытанні, што турбавалі сялян, былі добра знаёмыя аўтару, які вырас у сялянскай сям'і і ведаў, што такое праца. У апавяданнях К. Сваяк здолеў стварыць яркія народныя характары.

Такім чынам, уся творчасць пісьменніка глыбокапатрыятычная, прасякнутая ідэямі гуманізму. Гарантам лепшага жыцця для народа ў К. Сваяка выступае вера ў Бога. Асноўная мэта святара і мэта творцы заключаецца ў служэнні роднаму народу: словам і справамі.

**Літаратура**


1. *Сваяк, К.* Выбраныя творы / К. Сваяк ; уклад., прадм., камент. І. Багдановіч. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 472 с.
2. *Тарасюк, Л.* Журба ідэалу. Паэзія Казіміра Сваяка / Л. Тарасюк // Наша вера. – 2001. – №3. – С. 19–27.
3. *Трацяк, І.І.* Культурна-асветніцкая дзейнасць беларускіх каталіцкіх святароў (пачатак ХХ ст. – 1939 г.) : аўтарэф. дыс. ... канд. культурал. : 24.00.02 / І. І. Трацяк ; Гродз. дзярж. унів. імі Янкі Купалы. – Гр., 2000. – 18 с. '


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова